Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

Загад рэктара

№ 1363 лс ад 16.11.2011 г.

Факультэт эстэтычнай адукацыі

Кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

# САРМАЦКІ ПАРТРЭТ У БЕЛАРУСКІМ ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ: ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРА

Дыпломная работа па дысцыпліне:
"Методыка выкладання культуралагічных дысцыплін"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Студэнткі 5курса 55А групы
Сянько Таццяны Вячаславаўны
Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт
Васілевіч У.А.

Мінск 2012

## Уводзіны

Партрэт як самастойны жанр выяўленчага мастацтва на Беларусі склаўся ў 2-ой палове XVI стагоддзя. Сваю адметнасць атрымаў дзякуючы ідэалагічнаму падтэксту, звязанаму з ідэяй сарматызму. Больш чым за два стагоддзі свайго існавання дадзены партрэтны жанр зведаў пэўныя змены, якія былі цесна звязаны з культурна-гістарычнымі адметнасцямі часу.

**Актуальнасць** дыпломнай работы:

Вывучэнне эвалюцыі сармацкага партрэтнага жывапісу з нядаўняга часу нельга абмежаваць перыядам XVI – XVIII стагоддзяў. У канцы XX – на пачатку XXI стагоддзяў ў беларускім выяўленчым мастацтве з'явіліся новыя жывапісныя формы, асновай якіх з'яўляецца сармацкая ідэалогія і сармацкая партрэтная традыцыя. Інтэрпрэтацыя дадзеных мастацкіх палотнаў толькі часткова адпавядае першапачатковаму ўяўленню пра пэўны выяўленча-мастацкі жанр і ўтрымлівае сучасныя сусветныя і асабістабеларускія мастацкія тэндэнцыі. Трэба адзначыць, што адраджэнне нацыянальнай свядомасці з'яўляецца адной з асноўных падстаў для стварэння сучаснага сармацкага партрэта. Наватарскі, але з глыбокім гістарычным падтэкстам, неасармацкі партрэт з'яўляецца галіной яшчэ невывучанай, і ў сукупнасці з патрэтным жантам XVI – XVIII стагоддзяў, выкананым у сармацкай традыцыі, мае вялікую каштоўнасць, як для выяўленчага мастацтва Беларусі, так і сусветнага жывапісу.

Працэс навучання патрабуе ўсебаковага ўздзеяння на навучэнцаў. Пры вывучэнні сармацкага партрэту існуе ўнікальная магчымасць дакрануцца да гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва не толькі дзякуючы ілюстраваным дапаможнікам, але і на свае вочы ўбачыць веліч гістарычных вобразаў і пяра мастака. У сукупнасці з якаснымі метадычнымі распрацоўкамі і педагагічнымі, творчымі падыходамі магчымым з'яўляецца вывучэнне матэрыялу на новым высокім узроўні засваення ведаў і развіцця творчага патэнцыялу вучняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта** дыпломнай работы:

Вывучыць і прааналізаваць эвалюцыю развіцця сармацкага партрэтнага жывапісу ў беларускім выяўленчым мастацтве.

**Задачы** дыпломнай работы:

1. Прааналізаваць гісторыю ўзнікнення сармацкай ідэалогіі.

2. Прааналізаваць гісторыю развіцця сармацкага партрэта XVI – XVIII стстагоддзяў.

3. Ацаніць ролю сармацкага партрэтнага жывапісу на сучасным этапе развіцця мастацтва.

4. Прааналізаваць якасны ўзровень узаемадзеяння сармацкага партрэта XVI – XVIII стагоддзяў і "неасармацкага" патрэтнага жанра.

5. Разгледзець метадычны аспект вывучэння сармацкага патрэта.

6. Разгледзець экскурсію, як адзін з метадаў вывучэння сармацкага партрэта.

**Аб'ект даследавання** – сармацкі партрэт XVI – XVIII стагоддзяў, "неасармацкі" партрэт.

**Прадмет даследавання** – эвалюцыя жанра сармацкага партрэтнага жывапісу XVI – XVIII стагоддзяў і "неасармацкага" партрэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ